Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Галоўнае ўпраўленне па адукацыі Мінскага аблвыканкама
Упраўленне па адукацыі Маладзечанскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Лебедзеўская сярэдняя школа Маладзечанскага раёна»

**Інавацыйны праект**

«Укараненне мадэлі фарміравання і развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці навучэнцаў у сістэме ўзаемадзеяння ўстаноў адукацыі і дзіцячых, моладзевых грамадскіх аб'яднанняў»

Тэрмін рэалізацыі: 2020-2023 гады

# Даследчы праект
# «Развіццё камунікатыўных кампетэнцый навучэнцаў у працэсе даследчай дзейнасці «Знакамітыя людзі Лебедзеўшчыны: Рыгор Семашкевіч»



**Кіраўнік – Шыцік Ірына Адамаўна**

 аг.Лебедзева, вул.Савецкая, 37а
Тел.:80176545048; e-mail; shitik_1966@mail.ru

# “Нязгасная зорка”
# (прысвячаецца Рыгору Семашкевічу)

**Мэта праекта** – развіваць камунікатыўныя кампетэнцыі навучэнцаў у працэсе даследчай дзейнасці па тэме: “Знакамітыя людзі Лебедзеўшчыны: Рыгор Семашкевіч”

**Задачы:**

1. Збор, апрацоўка, сістэматызацыя інфармацыі пра асобу і творчую спадчыну Рыгора Семашкевіча

2. Папулярызацыя творчасці Рыгора Семашкевіча сярод навучэнцаў Лебедзеўскай сярэдняй школы

3. Развіццё навыкаў стварэння табліц, нарыса жыцця і творчасці, прэзентацый, тэкстаў лекцый, сцэнарыя конкурса

4. Фарміраванне ўмення праводзіць інтэрв’ю, выступаць з лекцыяй, праводзіць апытанне, апрацоўваць вынікі апытання.

**Удзельнікі праекта:**

**1. Гулецкая Дар’я** (вучаніца 9 класа) – даследчы накірунак
**2. Кліменя Ксенія** (вучаніца 9 класа) – камунікатыўны накірунак
**3.Пятроўская Вольга** (вучаніца 9 класа) – тэхнічна-інфармацыйны накірунак
**4. Шыцік Ірына Адамаўна** – настаўнік рускай мовы і літаратуры

# Рыгор Міхайлавіч Семашкевіч (1945 – 1982)



**Вынікі апытання навучэнцаў Лебедзеўскай сярэдняй школы**

**(30 рэспандэнтаў)**

| **Пытанні** | **Адказы** | **Колькасць адказаў** | **%** |
|---|---|---|---|
| 1. Хто такі Рыгор Семашкевіч? | 1) Пісьменнік<br>2) Не ведаю | 27<br>3 | 90<br>10 |
| 2. Што ён напісаў? | 1) Вершы, творы<br>2) Не ведаю | 8<br>22 | 27<br>73 |

Апытанне вучняў і апрацоўку вынікаў правяла Кліменя Ксенія


COCO

# Міні-лекторый “Нязгасная зорка”

## (Прысвячаецца Рыгору Міхайлавічу Семашкевічу)



Лебедзева і Лебедзеўшчына славіцца сваімі цудоўнымі людзьмі: працавітымі, гасціннымі, добрымі, разумнымі. Ёсць сярод іх вядомыя вучоныя, артысты, інжынеры, настаўнікі, мастакі і паэты. Кожны з іх па-свойму праславіў свой край, напісаў арыгінальную старонку яго гісторыі.

Наш творчы праект называецца “Нязгасная зорка”. Ён прысвечаны Рыгору Міхайлавічу Семашкевічу.

**Хто ж такі Рыгор Міхайлавіч Семашкевіч?** (пытанне да слухачоў)

**Рыгор Семашкевіч – асоба шматгранная і арыгінальная:** гэта паэт і празаік, навуковец і літаратурны крытык, літаратуразнавец і выкладчык. Да таго ж, гэта наш зямляк, які нарадзіўся ў вёсцы Дамашы Маладзечанскага раёна і скончыў Лебедзеўскую сярэднюю школу.

Нарадзіўся Рыгор Міхайлавіч Семашкевіч 12 верасня 1945 года ў вёсцы Дамашы. Яго бацькі, Міхаіл Філіпавіч і Алена Дзмітрыеўна, працавалі ў калгасе. Жылося ў пасляваенныя гады цяжка, але галоўнае – скончылася вайна, а працы ў сям’і Семашкевічаў не баяліся. Рыгор рана пацягнуўся да

ведаў: у Насілаўскую сямігодку яго прынялі, калі хлопчыку не было і 6-ці гадоў. Пасля сямігодкі ён вучыўся ў Лебедзеўскай сярэдняй школе, якую скончыў у 1961 годзе ў шаснаццацігадовым узросце.


БССР
МІНІСТЭРСТВА АСВЕТЫ

АТЭСТАТ СТАЛАС

Гэты атэстат выдан Семашкевічу Рыгору Міхайл...
нарадзіўшамуся ў в. Дамашы Маладзечанскага р-на 19...
у тым, што ён (яна), паступіўшы ў 1958 годзе ў сярэднюю школу №
в. Лебедзева Маладзечанскага раёна
(вёскі, горада)
Мінскай вобласці
(раёна, вобласці)
скончыў поўны курс гэтай школы і выявіў пры выдатных паводзінах на...
веды па прадметах:

| | | | |
|---|---|---|---|
| Беларуская мова | 5 (выдатна) | Канстытуцыя СССР | 5 (выда... |
| Беларуская літаратура | 5 (выдатна) | Геаграфія | 5 (выда... |
| Руская мова | 4 (добра) | Фізіка | 4 (добр... |
| Руская літаратура | 5 (выдатна) | Астраномія | 4 (добр... |
| Алгебра | 4 (добра) | Хімія | 4 (добр... |
| Геаметрыя | 4 (добра) | Замежная (нямецк.) мова | 4 (д... |
| Трыганаметрыя | 4 (добра) | Чарчэнне | 4 (добр... |
| Біялогія | 5 (выдатна) | Асновы вытворчасці | 4 (добр... |
| Гісторыя СССР | 5 (выдатна) | | |
| Усеагульная гісторыя | 5 (выдатна) | | |

Гэты атэстат дае яго ўладальніку права паступлення ў вышэйшыя н... ныя ўстановы Саюза ССР.

Выдан „25" чэрвеня 1961 г.
в. Лебедзева
Мінскай вобласці

Дырэктар школы
Загадчык навучальнай часткі школы
Настаўнікі:

№ 536423

**- У школьныя гады пачаў пісаць вершы і дасылаць артыкулы** ў

“Маладзечанскую газету”. Напрыклад, у сямейным архіве захаваўся яго допіс

“Юныя кукурузаводы”, надрукаваны ў “Маладзечанскай газеце” 17

кастрычніка 1959 года. Чатырнаццацігадовы юнак распавядае пра тое, як вучні Лебедзеўскай сярэдняй школы вырошчваюць кукурузу - тады яшчэ новую для Беларусі культуру.

**- Цікава склаўся далейшы лёс таленавітага юнака**

Пасля таго, як Рыгор Семашкевіч скончыў Лебедзеўскую сярэднюю школу, ён паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Там расцвіў яго паэтычны талент.

Пасля заканчэння БДУ быў накіраваны на працу дырэктарам Малінаўскай васьмігадовай школы Смаргонскага раёна. Але працаваў там нядоўга, бо пасля паступлення ў аспірантуру БДУ вярнууся ў Мінск і стаў выкладчыкам гэтай установы. Выкладаў беларускую літаратуру, вучыўся ў аспірантуры, друкаваўся, рыхтаваўся да абароны кандыдацкай дысертацыі. Абараніў яе ў 1970 годзе па тэме “Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе” (канец XIX – пачатак XX ст.ст.)

**- Рыгор Семашкевіч вядомы нам перш за ўсё як паэт**

Пісаць вершы Рыгор Семашкевіч пачаў рана, яшчэ ў школьныя гады. У 1960 годзе рэспубліканская газета “Голас Радзімы” надрукавала яго вершы “Зямля” і “Старыя дрэвы”, што і стала яго паэтычным стартам. Тады юнак быў вучнем дзясятага класа Лебедзеўскай сярэдняй школы. Але нават раннія вершы Рыгора былі вельмі шчырымі і сур’ёзнымі, надзвычай сталымі. У студэнцкія гады яго паэтычны талент узбагаціўся. Вершы Р. Семашкевіча друкаваліся ў розных выданнях: зборніку “Дзень паэзіі”, часопісах “Маладосць” і “Полымя” і інш.

**- У сваіх успамінах пра Рыгора Семашкевіча паэт Лідзія Гардынец піша так:** “І зноў, чарговы раз, трапляю ў палон такога простага і адначасова жывога і непаўторнага слова таленавітага земляка:

Па дарозе, з гоманам і крыкам,

У сяло сырым асеннім днём

Неслі дзеці грамадой вялікай

Жураўля з параненым крылом.

Нязмушана, светла і шчыра гучыць верш, а пад ім дата яго напісання – 1960 год. Здзіўляюся: нарадзіўся Рыгор Семашкевіч у 1945 годзе, значыць, пісаў

свайго “Жураўля” пятнаццацігадовым юнаком. Нібы адчуваючы нядоўгае жыццё, пачаў пісаць рана і адразу, як бачым, з такой кранальнай паэтычнай інтанацыяй, натуральна і непаўторна”.

- **Першы зборнік Рыгора Семашкевіча** называўся “Леснічоўка”, ён пабачыў свет у 1968 годзе.

Другі зборнік паэзіі быў надрукаваны ў 1973 годзе і меў назву “Субота”.

А ў 1974 годзе выйшла кніга яго вершаў “Золата саломы” ў перакладзе на рускую мову (перакладчык – Кавалёў). Так вершы паэта сталі вядомымі за межамі Беларусі.

- **Пра што пісаў у сваіх вершах Рыгор Семашкевіч?**

Паэтычная скарбонка Рамана Семашкевіча надзвычай разнастайная, але ёсць тэмы скразныя, якія паэта хвалявалі ўсё жыццё. Найперш, гэта тэма беларускай гісторыі, асабліва яе трагічныя старонкі. Вершы “Ашчаднае сярэднявечча”, “Таполі Максіма Багдановіча”, “Вайсковыя могілкі Мінска”, “Апошняя ноч Каліноўскага”, “Францішак Багушэвіч” перадаюць “вялікі дух вялікага народа” і ўдзячнасць тым, хто аддаў сябе нашай Бацькаўшчыне.

- Безумоўна, шмат вершаў Паэта прысвечана родным мясцінам, беларускай прыродзе, землякам і роднай хаце: “Развітанне з садам”, “Золата саломы”, “Родныя назвы”, “Леснічоўка”, “сад вартую..” і інш. Вершы Рыгора Семашкевіча напоўнены святочнасцю і харавством, якое мы не заўсёды бачым ў паўсядзённым жыцці. Вось як непаўторна піша паэт пра тое, як начаваў у садзе:

* * *

Сад вартую, і не спіцца мне.

Дзіўнае начное наваселле.

У маім прасторным будане

Смачна пахнуць яблыкі і сена.

Цішыня ў садзе шмат начэй …

Мо чакае хто гадзіны лепшай?

І сабака мой сузім здзічэў –

Як на зоры, на ранеты брэша.

Спяць дарогі, вербы ля ракі.

Я не сплю. І ціхі сум, і змора.

Хай бы ў сад залезлі хлапчукі,

Абтраслі і яблыкі, і зоры.

Хай бы кожны тут мурог таптаў,

Страх свой пасылаючы да д’ябла.

Я ж бы і сабаку патрымаў –

Свету не шкада ім, што там яблык!

Мо з сукоў хто пляснуўся б далоў –

І гурмой шумлівай уцякалі,

І з усіх сабак, вартаўнікоў

Мы на ўсё ваколле рагаталі.

**- Вам цікава было б даведацца, як паэт працаваў, як нараджаліся яго вершы?** (пытанне да слухачоў)

- Для кожнага паэта характэрна свая творчая атмасфера. Была яна і ў Рыгора Семашкевіча. Малодшая сястра Рыгора Міхайлавіча, Станевіч Таццяна Міхайлаўна, успамінае: “Брат доўга абдумваў свае вершы, насіў іх у галаве. Часта мне даводзілася назіраць, як ён хадзіў туды-сюды па пакоі, нешта засяроджана абдумваў, часам уключаў класічную музыку. Потым ён садзіўся за стол, засланы белым абрусам, а на стале заўсёды былі нагатове чарнільніца, пяро і папера. Садзіўся, пісаў гатовыя вершы”.

**- А вось яго сябар, паэт Мар’ян Дукса, распавядаў,** што вершы Рыгора Семашкевіча нараджаліся, калі ён хадзіў пешшу або быў у дарозе. Вось што ён піша ў сваіх успамінах: “У 60-я гады большасць пісьменнікаў стваралі свае творы ў Дамах творчасці ў Беларусі ці за яе межамі… Рыгор Семашкевіч там рэдка бываў. Ствараў ён свае творы толькі тады, калі не мог без гэтага абысціся – ці дома, ці ў дарозе, калі пеха вяртаўся з БДУ, дзе чытаў лекцыі. Яго ніколі не цікавіў вершаваны “вал”, да творчай спешкі, заўсёды адносіўся негатыўна”.

Родныя вобразы заўсёды перад вачамі Рыгора Семашкевіча, ён увасобіў іх у сваіх вершах.

* * *

Спакойныя, далёкія дубы.

Крыніца разам з птушкамі шчабеча.

Асенні кліч ласінае трубы

Заве ўглыб на векавое веча.

У гулкі край, дзе бог адзін – ляснік,

Я ўцяку, нібыта ў партызаны,

І будзе раніца. І першы крык.

І росныя туманныя паляны.

Зямля, ты гэта загадаеш мне

І завірухаю, і спелым ліўнем.

А папрашу ласкава – па вясне

Пяро на шчасце добры бусел скіне.

О Бацькаўшчына наша! Зноў і зноў

Ідзём ад спрэчак, радасці і працы,

Каб грэцца ля рабінавых кастроў

І чысціні шляхоў тваіх схіляцца.

**- Шматграннасць асобы Рыгора Семашкевіча з’яўляецца відавочнай.**

На погляд літаратурных крытыкаў, яго празаічныя творы не менш цікавыя і арыгінальныя, хоць і нешматлікія.

Возьмем, напрыклад, яго сатырычную аповесць “Бацька ў калаўроце”, якая выйшла ў 1976 годзе. Аўтар расказвае пра жыццё свайго героя, Зміцера Апанасавіча, праўдзіва, не таячы яго недахопаў і слабасцей. Мы бачым чалавека, які жыве кожнай хвілінай, дыхае на поўныя грудзі, знаходзіць асалоду ў самых простых рэчах. Са старонак аповесці дыхае паветрам савецкай эпохі, калі яшчэ марылі пабудаваць камунізм, хоць жылі вельмі сціпла. У аповесці ёсць месца жартам і розыгрышам, сатыры і гумару. Грамадскія і чалавечыя недахопы ляжаць на паверхні твора, быццам на талерцы. Непаўторны каларыт аповесці прыносіць мастацкую асалоду чытачу.

**- На жаль, засталася няскончанай аповесць Р. Семашкевіча “Ясень”.** Галоўны герой аповесці жыве ў горадзе, але думкамі ён дома, у роднай хаце, каля якой рос вялікі ясень – сімвал яго малой радзімы. Дзяцінства героя прайшло пад гэтым ясенем. Сталенне праходзіць праз супярэчнасці сучаснага жыцця, у якім матэрыяльны дастатак - замена чалавечаму шчасцю.

У жанры эсэ напісана “Світка Буйніцкага” , прысвечаная заснавальніку беларускага тэатра Ігнату Буйніцкаму.

**- Значны  след пакінуў Рыгор Семашкевіч як даследчык беларускай літаратуры**

Яшчэ ў студэнцкія гады Рыгор Семашкевіч захапіўся гісторыяй беларускай літаратуры дакастрычніцкага перыяду. Гэта захапленне стала асновай для стварэння навуковых прац па гісторыі літаратуры.

Даследчая праца Рыгора Семашкевіча  "Не згаснуць зоркі ў небе..." прысвечана Янку Купалу і распавядае пра ролю газеты "Наша ніва" ў творчасці беларускага класіка. Між тым у гэтым даследаванні ўпамінаецца наша Лебедзева і настаўнік Андрэй Фёдаравіч Посах, які шчыра сябраваў з Янкам Купалам.

Самай маштабнай літаратуразнаўчай працай Р. Семашкевіча стала манаграфія "Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе" (канец XIX – пачатак XX ст.ст.). Грунтоўнае даследаванне прысвечана развіццю беларускай думкі на мяжы XIX – XX стагоддзяў, раскрывае ролю Адама Гурыновіча, Браніслава Эпімах-Шыпілы, газеты "Гоман", суполкі "Загляне сонца і ў наша аконца" ў развіцці беларускай культуры.

На вялікі жаль, Рыгор Семашкевіч заўчасна пайшоў з жыцця, таму яго талент даследчыка не быў цалкам рэалізаваны.

**- Шмат можна расказаць пра Рыгора Семашкевіча як літаратурнага крытыка.**

- Яго талент праявіўся тут у поўнай меры. Таленавітых літаратурных крытыкаў наогул вельмі мала. І вось адзін з іх – Рыгор Семашкевіч. Ён добра ведаў сучасную яму беларускую літаратуру, уважліва сачыў за нараджэннем новых талентаў, быў асабіста знаёмы з усімі тагачаснымі пісьменнікамі. Яго літаратурна-крытычныя артыкулы прысвечаны многім: Рыгору Барадуліну ("Ганчарны круг паэта"), Яўгеніі Янішчыц ("Выпрабаванне любоўю"), Алегу Лойку ("Пераканаўчасць гістарызму"), Ніне Мацяш ("Адчуванне шляху"), маладым паэтам-дэбютантам ("Зашчымела слова, зашчымела...") і інш. Дзякуючы яго артыкулам, сталі вядомымі многія беларускія творцы.

**-  Рыгор Семашкевіч застаўся ў гісторыі Беларусі як таленавіты паэт, сур'ёзны** навуковец, прафесійны літаратурны крытык. Але гэта найперш цікавы, непаўторны чалавек, АСОБА. Пра гэта скажам коратка.

Асоба Рыгора Семашкевіча нам ўяўляецца таленавітым каштоўным самародкам, у якім адкрыты далёка не ўсе грані. Адкрыць усе грані таленту Рыгора Семашкевіча і ёсць наша галоўная мэта.

**- З вамі былі ўдзельнікі творчага праекта "Нязгасная зорка" : Кліменя Ксенія, Пятроўская Вольга, Гулецкая Дар'я.**

# Работа ў музеі “Спадчына”



## Тэматыка вершаў Рыгора Семашкевіча

### (Табліцу склала Гулецкая Дар'я)

| Асноўныя тэмы | Вершы |
|---|---|
| **Родная прырода** | “Журавель” (1960), “На беразе рэчкі заціхлі бярозы…” (1961), Дзівасіл” (1961), “Сакавік” (1962), “Сад вартую…” (1963), “Спакойныя, далёкія дубы…” (1964), “Чырвонае лета” (1965), “Зязюля” (1966), “Вар'яцелі цёплыя дажджы…” (1966), “Іранічная восень” (1967) і інш. |
| **Традыцыі беларусаў** | “Можа ёсць дзе барана старая…” (1964), “Май” (1965), “Пра зямлю” (1966), “Мые вадой дажджавой валасы” (1966), “Золата саломы” (1966), “Бывай, святам поўны дом гасцей..” (1967), “Работнік” (1960) і інш. |
| **Родны кут** | “Людзі вітаюцца…” (1961), “Родныя назвы” (1961), “За ліўнямі, за аркамі вясёлак…” (1962), “Пыл з плячэй дарожны абтрасай…” (1964), “Прыязджайце ў чацвер” (1966) і інш. |
| **Непаўторнае дзяцінства** | “Урокі малявання я любіў..” (1964), “Удар – і мяч ля сонца высокага…” (1964), “Вялікі расці!” (1966) і інш. |
| **Беларуская гісторыя** | “Кастусь Каліноўскі” (1966), “Маёнтак” (1967), “Апошняя ноч Каліноўскага” (1967), “Вайсковыя могілкі Мінска”, “Магіла лётчыкаў” (1962), “Салдат” (1964) і інш. |
| **Філасофскія тэмы** | “Дзень” (1961), “Начлежныя вершы” (1963), “Не наракаю на цябе, мой лёс…” (1964), “І гэты вечар. Дождж і гром…” (1966), “Каляровыя сны” (1966), “Ніколі не любіў рашаць задачкі…”, “Гімн руцэ” (1967). “Нявольнік розуму свайго” (1967) і інш. |

## Кнігі Рыгора Семашкевіча
## (Апрацоўка фотаздымкаў – Пятроўскай Вольгі)




**Семашкевіч, Р. Субота: Вершы / Р. Семашкевіч. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1973. — 110, [1] с.**
**Сувязь гістарычнага мінулага нашага народа з гераічным сённяшнім, апяванне роднай прыроды, высакародных пачуццяў любві, дружбы — асноўныя тэмы кнігі**




**Семашкевіч, Р. Бацька ў калаўроце: аповесць / Р.Семашкевіч. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. — 175 с.**
**Галоўны герой гумарыстычнай аповесці «Бацька ў калаўроце» — няздатны вучоны і педагог, якога дасціпныя аспіранты празвалі**

**Бацькам. У гратэскнай форме аўтар высмейвае некаторыя праявы псеўданавуковасці і прыстасаванства ў навуковым асяроддзі.**




**Семашкевіч, Р. Выпрабаванне любоўю: Эсе, артыкулы / Р. Семашкевіч. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1982. — 206 с.**
**У кнізе шмат увагі надаецца пытанням развіцця беларускай літаратуры і культуры пачатку XX стагоддзя. Аўтар аналізуе творчасць беларускіх паэтаў Р.Барадуліна, Я.Янішчыц, Ю.Голуба, В.Коўтун, А.Разанава.**




**Семашкевіч, Р. Лічыла дні зязюля: Вершы, аповесці, эсе / Р. Семашкевіч; Прадм. Д. Бугаева. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1987. — 508 с.**
**У лепшых вершах Р.Семашкевіча выразна адчуваецца чалавечая душа аўтара, яго спагадлівасць да людзей, яго жыццялюбства. Паэту**

**характэрна дакладнасць у адлюстраванні жыццёвых рэалій, апора на ўласна перажытае, ўменне перадаць і зберагчы і песенныя інтанацыі, і парывістасць танца, і плаўнасць апавядання.**




**Семашкевіч, Р. Янка Купала і беларускае адраджэнне: [выбраныя творы] / Рыгор Семашкевіч. — Маладзечна : Победа, 2012. — 195, [2] с. У кнігу выбраных твораў Рыгора Семашкевіча ўвайшло ўсё лепшае з яго навуковай спадчыны. Пачынаючы ад нарыса «Янка Купала і Наша Ніва» і заканчваючы манаграфіяй «Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе (канец XIX — пачатак XX ст.)». Напісаная ў канцы 60-х — пачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя яна вызначаецца высокім прафесійным узроўнем, неардынарнасцю думак і смеласцю высноў.**

## Работа з сабранымі матэрыяламі

*1. Складанне табліцы вынікаў апытання вучняў*

*2. Апрацоўка інтэрв'ю з сястрой Рыгора Семашкевіча Станевіч Таццянай Міхайлаўнай*

*3. Складанне спіса кніг Р. Семашкевіча*

*4. Распрацоўка тэкста міні-лекторыя "Нязгасная зорка"*

*5. Складанне табліцы "Тэматыка твораў Рыгора Семашкевіча"*

*6. Стварэнне прэзентацыі "Нязгасная зорка"*

*7. Стварэнне электроннай базы матэрыялаў "Рыгор Семашкевіч"*




## Вынікі работы над праектам

**1)** Работа над праектам “Нязгасная зорка” дала ўдзельнікам новыя веды пра Рыгора Семашкевіча і яго паэзію.

**2)** Рабяты навучыліся шукаць патрэбную інфармацыю, працаваць з артыкуламі, рыхтаваць лекторый, ствараць прэзентацыю.

**3)** Дзевяцікласніцы паспрабавалі праводзіць апытанне, выступаць з лекцыяй, складаць табліцы, нарыс жыцця і творчасці.

**4)** Але самае галоўнае, што даў праект, - гэта навыкі зносін з людзьмі розных узростаў: дарослымі і вучнямі.